УДК 94(476)
ББК 63.(4 Беи)
С916

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета БДПУ

Рэдкалегія:
старшыня арганізацыйнага камітэта канферэнцыі, доктар гістарычных навук, прафесар, дэкан гістарычнага факультэта БДПУ *М.М. Забаўскі*;
доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры славянскай гісторыі і метадалогіі гістарычнай навукі БДПУ *А.П. Жытко* (навук. рэд.);
доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры гісторыі новага і навейшага часу БДПУ *Г.А. Космач*;
доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры гісторыі Беларусі БДПУ *А.М. Лютый*;
доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры айчыннай і сусветнай гісторыі БДПУ *В.А. Пілецкі*;
доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры гісторыі старажытных цывілізацый і сярэднявечча БДПУ *У.В. Тугай*;
доктар гістарычных навук, прафесар кафедры гісторыі старажытных цывілізацый і сярэднявечча БДПУ *М.І. Мініцкі*;
доктар гістарычных навук, прафесар кафедры гісторыі Беларусі БДПУ *М.К. Сакалоў*;
доктар гістарычных навук, прафесар кафедры славянскай гісторыі і метадалогіі гістарычнай навукі БДПУ *В.М. Фамін*;
доктар гістарычных навук, прафесар кафедры гісторыі новага і навейшага часу БДПУ *І.Р. Чыкалава*;
начальнік Вучэбна-выдавецкага цэнтра БДПУ *В.Я. Навагродскі*

Сучасныя падыходы да вывучэння крыніц па гісторыі Беларусі. Да 1000-годдзя
С916 летапіснай Літвы: матэрыялы Рэсп. навук.-тэарэт. канф., г. Мінск, 18 снеж. 2009 г. / Бел. дзярж. пед. ун-т імя М. Танка; рэдкал. М.М. Забаўскі, А.П. Жытко (навук. рэд.), Г.А. Космач і інш. – Мінск: БДПУ, 2009. – 248 с.
ISBN 978-985-501-841-5.

У матэрыялах канферэнцыі разглядаюцца сучасныя падыходы да вывучэння крыніц па актуальных пытаннях сацыяльна-эканамічнай і палітычнай гісторыі Беларусі са старажытных часоў да сучаснасці.

Адрасуецца навукоўцам, выкладчыкам, студэнтам вышэйшых навучальных устаноў і ўсім, хто цікавіцца праблемамі айчыннай гісторыі.

УДК 94(476)
ББК 63.(4 Беи)

ISBN 978-985-501-841-5

© БДПУ, 2009

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка»

Гістарычны факультэт

СУЧАСНЫЯ ПАДЫХОДЫ ДА ВЫВУЧЭННЯ КРЫНІЦ ПА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ

ДА 1000-ГОДДЗЯ ЛЕТАПІСНАЙ ЛІТВЫ

Матэрыялы Рэспубліканскай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі
г. Мінск, 18 снежня 2009 г.

Мінск 2009

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

В частности, описывая реакцию М.С. Горбачева на подписание Беловежских соглашений, отмечает, что тот «все еще наивно верил, что процесс распада страны на пятнадцать независимых государств можно повернуть вспять» [1, с. 214]. Но ведь еще 6 сентября 1991 г. Государственный Совет СССР (высший распорядительный орган, созданный V-м Съездом народных депутатов СССР) принял Постановление «О признании независимости Литовской Республики». Такие же постановления были приняты и в отношении признания независимости Латвийской Республики и Эстонской Республики. Вскоре после это, 17 сентября 1991 г., они были приняты в ООН, их статус как независимых государств получил признание во всем мире.

Другая неточность касается отставки польского премьер-министра Я. Ольшевского. Так, В.Ф. Кебич остановился на подробностях своей неофициальной встречи с польским коллегой в Беловежской пуще в марте 1992 г., которая «закончилась пьянкой». Это просочилось в прессу и вызвало политический скандал и последующую отставку [1, с. 315]. На самом деле причиной отставки явилась кампания по публичному обвинению многих лидеров Польши, в том числе и Леха Валенсы, в том, что они являлись агентами тайной полиции.

Сочетание в мемуарах моментов «достоверного» и «вымысла» составляет огромные трудности для исследователя. Пропорция соотношения обоих элементов может сильно варьироваться. В этой связи для проверки полноты и достоверности мемуаров, конечно же, следует сравнить их с опубликованными воспоминаниями других политических деятелей того времени (Н.И. Дементея, П.К. Кравченко, С.И. Наумчика и др.), в которых описываемые события так или иначе пересекаются с событийной канвой анализируемых мемуаров.

Что касается личности автора данных мемуаров, то можно с полной уверенностью говорить о его осведомленности о тех событиях, которые имели место в нашей недалекой истории. Другое дело, насколько полно он раскрывает эти события, показывает скорее свою положительную роль в становлении и развитии политической и экономической системы суверенной Республики Беларусь, при одновременном акцентировании на негативной роли других участников (С.С. Шушкевича, З.С. Позняка, П.К. Кравченко и т. д.). Для большей убедительности своих доводов В.Ф. Кебич приводит отрывки либо полный текст своих выступлений в средствах массовой информации и Верховном Совете [1, с. 52–55, 178–180], заявлений Н.И. Дементея, В.В. Коваленка и др. [1, с. 249–250], отклики зарубежных средств массовой информации на проблемы экономической и политической интеграции на постсоветском пространстве, события в России, Беларуси, Украине [1, с. 287–291]. Хотя справедливости ради следует отметить, что в изложении событий он опирается, главным образом, на собственную память. При этом умолчание о чем-либо не всегда является признаком плохой

памяти В.Ф. Кебича, а скорее результатом отбора, отсева событий, анализа их под углом зрения определенной идейной концепции.

В своих мемуарах В.Ф. Кебич охватывает период с 1985 г. по 2000-е гг., иногда ссылаясь на события из более раннего периода своей деятельности. В данной статье временные рамки были ограничены 1985–1994 г.

Таким образом, можно с уверенностью констатировать, что мемуары являются важным источником для проведения исторического исследования. Однако к ним следует относиться крайне осторожно в силу их противоречивости, порой тенденциозности, неточности и неполноты в изложении и трактовке фактов. Поэтому один из эффективных методов проверки полноты и достоверности мемуаров (воспоминаний, размышлений и других источников личного происхождения) – это их сопоставление с другими источниками, которые освещают те же события. Только в этом случае возможно создать объективную историческую картину.

Литература

1. Кебич, В.Ф. Искушение властью: из жизни премьер-министра / В.Ф. Кебич. – Минск: Парадокс, 2008. – 480 с.
2. Назарбаев, Н.А. Мы строим новое государство: Труды и речи / Н.А. Назарбаев. – М.: ПАЛЕЯ-Мишин, 2000. – 350 с.
3. Кремнев, П.П. Распад СССР: международно-правовые проблемы / П.П. Кремнев. – М.: Зерцало, 2005. – 255 с.

СУЧАСНЫЯ МЕТАДЫ АПРАЦОЎКІ СТАТЫСТЫЧНЫХ МАТЭРЫЯЛАЎ І МАСАВЫХ КРЫНІЦ САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ КАНЦА XVIII – ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XIX ст.

А.М. Люты (г. Мінск, БДПУ, прафесар)
А.Э. Лютая (г. Мінск, БДПУ, дацэнт)

Статыстычны матэрыял, даныя масавых крыніц неабходна падвяргаць параўнальнаму аналізу і матэматычнай апрацоўцы, пры гэтым улічваць наступныя прынцыпы даследавання:

- пабудова табліц на падставе даных масавага парадку, а не асобных прыкладаў;
- складанне дынамічных радоў статыстычных даных толькі з супараўнальных лічбаў;
- вывядзенне сярэдніх велічынь толькі для эканамічна-аднародных спалучэнняў;
- выкарыстанне прыёму другаснай групоўкі на аснове статыстычных даных крыніц;
- спалучэнне абагульненняў прынцыповага парадку са значнай колькасці канкрэтных рэгалій;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- узаемасувязь вывучаемых з'яў;
- выкарыстанне ўсіх крыніц па даследуемай праблеме;
- разгляд з'яў і працэсаў у межах вывучаемага перыяду і інш. [1].

Разам з традыцыйнымі метадамі аналізу ў сучасных даследаваннях выкарыстоўваецца часта фармалізаваны метад, так званы кантэнт-аналіз, сутнасць якога зводзіцца да таго, каб вызначыць такія лёгкавылічальныя даныя дакумента, з дапамогай якіх магчыма вызначыць яго якасны змест. Абмежаванасць фармалізаванага аналізу заключаецца ў тым, што далёка не ўвесь змест дакумента можа быць вызначаны з дапамогай фармальных паказчыкаў.

Перш за ўсё неабходна скласці спіс індыкатараў, якія цікавяць даследчыка (першасных паняццяў). Далей уводзяцца катэгорыі – больш буйныя паняцці, якія прадстаўляюць класы індыкатара. Выдзяленне сэнсавых адзінак аналізу з'яўляецца метадалагічнай задачай. Сэнсавай адзінкай павінна быць сацыяльная ідэя, сацыяльна значная тэма [2].

У тэксце яна выражаецца па-рознаму: адным словам, устойлівым спалучэннем слоў, наогул не мае відавочнага тэрміналагічнага выражэння і выконваецца апісальна.

Прыёмы кантэнт-аналізу выкарыстаны Б.Н. Міронавым для апрацоўкі шматлікіх звестак аб гандлі. На аснове дэталёвага знаёмства з матэрыяламі аб гандлі на адказах на гаспадарчыя анкеты, а таксама тапаграфічнымі і статыстычнымі апісаннямі губерняў XVIII – XIX стст. была складзена праграма сістэматызацыі фармалізацыі першасных даных аб кірмашах, якая мела выгляд анкеты, што ўключала 24 пытанні і ўсе магчымыя варыянты адказаў на іх, якія найбольш вычарпальна давалі інфармацыю аб гандлі, заключаную ў любым адказе.

Аналізуемымі катэгорыямі з'явіліся варыянты адказаў, колькасць якіх хісталася ад 3 да 76 для розных пытанняў. Сярод пытанняў асаблівую цікавасць выклікаюць наступныя: профіль кірмашу па дамінуючых на ім тавараў; тып кірмашу па дамінуючым характары гандлю і прызначэнне кірмашу; галоўныя групы і тыпы тавараў (мясцовага і прывазнога характару); сувязь з іншымі кірмашамі; склад удзельнікаў кірмашоў і г. д.

Вынікі аналізу былі зведзены Б.М. Міронавым у табліцах, якія дэталёва раскрываюць характар і структуру кірмашовага гандлю Расіі ў другой палове XVIII – першай палове XIX ст. [3].

У даследаваннях па сацыяльна-эканамічнай гісторыі Беларусі другой паловы XVIII – першай паловы XIX ст. указаны метад шырока выкарыстоўваецца не толькі пры асвятленні пытання аб гандлі, але на яго падставе былі распрацаваны праграмы фармалізацыі і генералізацыі даных аб дыферэнцыяцыі сялянства ў прамысловым развіцці Беларусі. Для даследчыкаў гэты метад быў важны яшчэ таму, што крыніцы другой паловы XVIII ст. па сваім характары і прызначэнні

утварэння адрозніваліся ад крыніц першай паловы XIX ст., а гэта ўскладняла іх супастаўляльны аналіз.

Фармалізацыя і генералізацыя крыніц, іх кантэнт-аналіз дапамагалі больш дакладна ахарактарызаваць тэндэнцыі і заканамернасці, даць больш пашыраную трактоўку даных.

Для ўстанаўлення дакладнасці інфармацыі масавых крыніц (губернатарскіх справаздач, перапісаў, інвентароў) можна выкарыстоўваць карэляцыйны аналіз. Вызначаемы каэфіцыент карэляцыі (R) дазваляе ўстанавіць, якая частка зменлівасці залежнай пераменнай (адной з'явы) тлумачыцца за кошт зменлівасці незалежнай пераменнай (другой з'явы).

Аднак складанасць гэтага метаду заключаецца ў тым, што карэляцыйных каэфіцыентаў каля дзесяці разнавіднасцей, кожны з якіх мае сваю спецыфіку, пэўныя дапушчэнні. Таму неабходна вызначыць найбольшую эфектыўнасць выкарыстоўваемага каэфіцыента пры аналізе гэтага гістарычнага матэрыялу.

Пры вылічэнні карэляцыйнай сувязі для дынамічных радоў узнікае яшчэ адна праблема. У тым выпадку, калі значэнне карэляцыйнага каэфіцыента вялікае, то гэта гаворыць аб цеснай залежнасці. У той жа час на велічыню каэфіцыента і тым самым на характар яго інтэрпрэтацыі ўплывае і колькасць выдзеленых часовых інтэрвалаў. І атрымоўваецца, што велічыня карэляцыйнага каэфіцыента пры неабгрунтаваным выбары інтэрвалаў адлюстроўвае не ступень залежнасці паміж прыметамі, а характар усярэдненасці даных дынамічных радоў [4]. Пры разглядзе, напрыклад, пытання аб дынаміцы колькасці насельніцтва статыстычны матэрыял намі быў пераведзены ў адносныя лічбы. Мы, напрыклад, выкарысталі два разрады індэксаў – базісныя і ланцуговыя. Падставай для базісных індэксаў быў узяты паказчык колькасці насельніцтва (ці групы насельніцтва) па IV рэвізіі, на які і дзялілі паказчык кожнай наступнай рэвізіі. Такім чынам, атрымалі ўяўленне аб тым, як змянялася колькасць насельніцтва ў параўнанні з паказчыкам IV рэвізіі. Не меншую цікавасць уяўляе разгляд змен, якія адбываліся паміж асобнымі рэвізіямі, для чаго мэтазгодней выкарыстоўваць ланцуговыя індэксы. Мы іх атрымалі пры дзяленні паказчыка душ кожнай рэвізіі на папярэдні паказчык рэвізіі.

Атрыманыя вынікі можна паказаць у працэнтах, паколькі 1/100 індэкса гэта 1 %. Даныя сяэднегадавога тэмпу прыросту насельніцтва павялічвалася па формуле сярэдняй геаметрычнай

$$X\text{геом} = n\sqrt{\frac{Yn}{Yo}},$$

дзе n – колькасць гадоў, y_N – колькасць людзей у канцы перыяду, y_O – колькасць людзей у пачатку перыяду.

З дапамогай лагарыфма падлікі можна правесці па формуле $X = \frac{\log(Yn/Yo)}{n}$

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Апрацоўку масавых крыніц (інвентароў, рэвізскіх сказак) можна выконваць з дапамогай ЭВМ, асабліва для выканання працаёмкіх пошукаў параўнальных крыніц і іх групоўкі. Апісанне праграмы групоўкі аб'ектаў, фактаў падзей па прынцыпе найбольшага падабенства (зыходзячы з метаду графаў), распрацаванай Г.Ф. Эстамброкам і дапоўненай М. Каралін, дадзена ў працы эстонскага вучонага Ю. Кахка [5].

Мы выкарыстоўвалі гэту праграму для вывучэння працэсу маёмаснай і сацыяльнай дыферэнцыяцыі сялянства Беларусі ў другой палове XVIII – першай палове XIX ст. Тут было вельмі важна вызначыць прыкметы групоўкі і тыпалогіі сялянскіх гаспадарак. У.І. Ленін, даследуючы гэту праблему, неаднаразова звяртаў увагу на комплексны падыход пры вызначэнні тыпалогіі сялянскіх гаспадарак. Ён заўсёды выказваўся супраць спрашчэння і скажаючых карціну гістарычнай рэчаіснасці прыёмаў групоўкі на аснове адной прыкметы, заўважаючы, што калі сялянскія гаспадаркі і прыйдзецца размяркоўваць на падставе паказчыкаў сацыяльна-эканамічнага характару, то заўсёды трэба рабіць праверку, ці выражаюць гэтыя паказчыкі характэрныя тэндэнцыі той сістэмы, якую прадстаўляюць гэтыя паказчыкі ці звязаныя з імі іншыя прыкметы [6].

Думаецца трэба згадзіцца з Ю.Ю. Кахкам, які прапануе ўлічваць адначасова тры групы прыкмет: 1) паказчыкі эканамічнага патэнцыялу сялянскіх гаспадарак; 2) паказчыкі цяжкасці феадальных павіннасцей; 3) сінтэтычныя паказчыкі, што сведчаць аб тым, у якім становішчы знаходзілася сялянская гаспадарка (добра або дрэнна яна была забяспечана рабочай сілай і харчаваннем) [7].

Мэтаматычныя метады дапамагаюць правесці аналіз крыніцы на больш высакаякасным узроўні, дакладней ахарактарызаваць тэндэнцыі і заканамернасці. Даць расшыраную трактоўку даных. Якасны змест крыніцы становіцца вымераным у лічбах, даступным вылічальным аперацыям для машыннай апрацоўкі масавых даных. Аднак абмежаванасць фармалізаванага аналізу заключаецца ў тым, што далёка не ўсё багацце зместу дакумента можа быць вымерана з дапамогай лікавага паказчыка. Шэраг вучоных адзначае перавагу суб'ектыўнага фактару пры складанні праграм для матэматычнай апрацоўкі [8].

Сапраўды, такія даныя, як размеркаванне зямель па надзелах, сяўба і ўраджай збожжавых, феадальныя павіннасці і іншыя часта цяжка выкарыстоўваць у сістэме розпай ступені паўнаты ўліку, розных метадаў іх збору або неаднолькавасці крытэрыяў, выкарыстаных пры іх першаснай апрацоўцы. Таму даныя па адных тых жа пытаннях, але для розных перыядаў, а часам і гадоў, нярэдка даюць супастаўляльныя, хоць на першы погляд і здаюцца такімі. Часам матэматычная апрацоўка гэтых даных скажае рэчаіснасць, прыводзіць да няправільных высноў. таму матэматычныя метады неабходна спалучаць з традыцыйным якасным аналізам абмежаванага кола крыніц, заснаванага на метадзе статыстычнай выбаркі. Прымяненне выбарачнага метаду грунтуецца на законе большых лікаў

сутнасць якога зводзіцца да наступнага вываду, даказанаму амерыканскім сацыёлагам Хэнэсі. Для таго каб даведацца аб меркаванні людзей па той або іншай праблеме, зусім не абавязкова апытваць дзесяткі тысяч чалавек, а можна абмежавацца апытаннем некалькіх соцень, г. зн. пры выпадковасці выбаркі крыніцы агульны вынік будзе такім жа, як і пры апрацоўцы ўсёй масы крыніц, па гэтым пытанні [9]. Выпадковасць выбаркі дасягаецца з дапамогай спецыяльна распрацаваных табліц выпадковых лікаў [10].

Аднак даследаванні апошніх гадоў паказваюць, што матэматычныя метады даследавання масавых крыніц пераважаюць [11], паколькі яны даюць магчымасць аднаму гісторыку апрацоўваць дастаткова хутка вялікую колькасць фактычнага матэрыялу, што асабліва важна пры вывучэнні працэсаў сацыяльна-эканамічнага характару.

У гэтым плане асаблівую цікавасць прадстаўляюць новыя методыкі для квантытатыўнай апрацоўкі статыстычнага матэрыялу, распрацаваныя польскім гісторыкам І. Рыхлікавай. Яна прапанавала арыгінальныя спосабы давядзення рознатыповых крыніц (матэрыялы перапісу насельніцтва, састаўленыя па асобных паветах) да стану параўнання, што дазволіла ёй выкарыстаць квантытатыўныя метады. Прадметам даследавання І. Рыхлікавай з'яўлялася сацыяльна-эканамічная дыферэнцыяцыя памешчыкаў з канца XVIII да сярэдзіны 60-х гг. XIX ст. Пры вывучэнні прыналежнасці да маёмасных слаёў яна прыняла за аснову дзесятковую сістэму і крывую Лорэнца. Дзякуючы паказчыку канцэнтрацыі, заснаванаму на некалькіх крытэрыях (зямля, даход, падаткі, колькасць насельніцтва ў памесці), ёй удалося параўнаць ступень расслаення класа ў розных эканамічных раёнах і ў розных храналагічных разрэзах [12]. Гэта надало статыстычным даным параўнальны характар і было важна, паколькі афіцыйная статыстыка як мясцовая, так і цэнтральная, не адпавядае гэтым патрабаванням, нягледзячы на выгляд сістэматычнасці і дакладнасці. Яна пазбаўлена адзіных прынцыпаў збору, праверкі і апрацоўкі паступаючай інфармацыі, акрамя таго яе даныя, як правіла, сумарныя і не паддаюцца праверцы і групоўцы.

Усе выкарыстаныя ў даследаваннях сацыяльна-эканамічнага характару лічбавыя і фармалізаваныя матэрыялы неабходна згрупаваць і звесці ў табліцы.

Літаратура і крыніцы

1. Ленин, В.И. Полн. собр. – Т. 3. – С. 2–609; Т. 17. – С. 57–137; Т. 27. – С. 299–426.
2. Ковальченко И.Д., Бородкин Л.И. Современные методы изучения исторических источников с использованием ЭВМ / И.Д. Ковальченко, Л.И. Бородкин. – МГУ, 1987. – С. 13.
3. Миронов, Б.Н. Внутренний рынок России во второй половине XVIII в. – первой половине XIX в. / Б.Н. Миронов. – Л.. 1981; Ён жа. Формализация и генерализация содержания массовых источников (на материалах анкеты о

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ярмарках 1779 г.) // Вспомогательные исторические дисциплины. – Л., 1982. – Т. 13. – С. 209–222.
4. Славко, Т.И. Возможности и ограничения применения математических методов в исторической науке / Т.И. Славко // Советская историография аграрной истории СССР (до 1917 г.). – Кишинев. – С. 77–78.
5. Кахк, Ю. К вопросу о типологии крестьянских хозяйств в Эстонии в начале XIX в. / Ю Кахк. – Таллинн, 1975. – С. 69–78.
6. Ленин, В.И. Полн. собр. соч. – Т. 3. – С. 273; Т. 7. – С. 150–151; Т. 27. – С. 193.
7. Кахк Ю. Указ. ТВ. С. 7.
8. Хайтун, С.Д. Наукометрия: состояние и перспективы / С.Д. Хайтун. – М., 1983. – С. 29.
9. Кахк, Ю.Ю. Применение метода статистической выборки при анализе ревизских сказок первой половины XIX в. / Ю.Ю. Кахк // Источниковедение проблемы истории народов Прибалтики. – Рига, 1970. – С. 332–333.
10. Кадыров, М. Таблицы случайных чисел / М. Кадыров. – Ташкент, 1936.
11. Тезисы докладов совещания "Комплексные методы в изучении истории с древнейших времен до наших дней" (20–22 февраля 1985 г.). – М., 1984. – С. 1–197.
12. Rychlikowa, I. Dzieje ziemianstwa w latach 1795–1945: Larys problematyki babawczej / I. Rychlikowa // Dzieje Nainowze. – 1976. – № 1.

ПІСЬМОВЫЯ КРЫНІЦЫ ПА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XX – ПАЧАТКУ XXI СТ. У ХРЭСТАМАТЫЙНАЙ ЛІТАРАТУРЫ АГУЛЬНААДУКАЦЫЙНАЙ ШКОЛЫ

В.М. Фамін (г. Мінск, БДПУ, прафесар)
С.В. Паноў (г. Мінск, РІВШ, дацэнт)

Пасляваенны перыяд гісторыі Беларусі характарызаваўся высокімі тэмпамі індустрыяльнага развіцця краіны, а разам з гэтым і хуткім пашырэннем гістарычных крыніц. Найбольш масавую іх групу складаюць пісьмовыя крыніцы, колькасць якіх па гэтым перыядзе практычна бязмежна. У практыцы склаліся тры прынцыпы класіфікацыі пісьмовых крыніц: а) па змесце, б) па паходжанні, в) па відах крыніц. Апошні найбольш распаўсюджаны. Пад ім разумеецца сукупнасць падобных прыкмет зместу, паходжання і формы.

Складанасць крыніцазнаўчай працы па гісторыі дадзенага перыяду вынікае з супярэчнасці паміж неабходнасцю браць усю сукупнасць фактаў, якія тычацца

вывучаемага пытання, без адзінага выключэння, і немагчымасцю фізічна ажыццявіць гэта на практыцы. Таму неабходна спалучаць прыцягненне па магчымасці максімальнай колькасці крыніц абагульняльнага характару, пры пэўнай абмежаванасці выкарыстання тых, якія носяць ілюстрацыйны характар.

Хаця выкарыстанне пісьмовых гістарычных крыніц з'яўляецца асновай кожнага гістарычнага даследавання, фарміраванне разумення неабходнасці гэтага ў даследчыкаў фактычна пачынаецца са школьнай парты.

Вывучэнне гісторыі, як і яе даследаванне, грунтуецца на дакументальных крыніцах. Азнаямленне з імі дазваляе інтэгравацца ў культурна-гістарычнае асяроддзе з улікам асаблівасцей, характэрных для вывучаемага часу, сфарміраваць больш дакладнае ўяўленне аб гістарычных падзеях і іх удзельніках. Вучні і студэнты, авалодваючы ўменнямі працы з гістарычнымі дакументамі, далучаюцца да майстэрства гісторыка, пачаткаў яго прафесійнага майстэрства, што садзейнічае рэалізацыі дзейснага падыходу ў навучанні і замацаванню пазнавальнага інтарэсу.

У вучэбным кнігавыданні Рэспублікі Беларусь функцыю працы з дакументальнымі матэрыяламі першапачаткова адыгрывалі падручнікі і вучэбныя дапаможнікі, дзе непасрэдна ў вучэбных тэкстах ці спецыяльных рубрыках размяшчаліся адпаведныя матэрыялы, якія адлюстроўвалі вывучаемыя падзеі ці пэўныя пункты гледжання. Як правіла, такія дакументальныя матэрыялы мелі апарат засваення ў выглядзе асобных пытанняў.

У пачатку 2000-х гг. убачыла свет такая спецыяльная літаратура, як хрэстаматыі, якія з'явіліся арганічнай часткай вучэбна-метадычнага комплексу. Аналіз шэрагу выданняў дазваляе вызначыць дзве тэндэнцыі ў падрыхтоўцы вучэбнай хрэстаматыйнай літаратуры, абумоўленыя існаваннем вучэбных і навуковых гістарычных ведаў і вырашэннем праблемы іх пераводу. Першая тэндэнцыя звязана з наступным:

- структураваннем дакументальных матэрыялаў у адпаведнасці з раздзеламі вучэбнай праграмы і параграфамі вучэбных дапаможнікаў;
- адаптацыяй зместу ўжываемых у хрэстаматыях дакументаў і матэрыялаў да ўзроставых і пазнавальных магчымасцей вучняў;
- складаннем кароткіх перадумоў-каментарыяў да кожнага з дакументаў, якія выконваюць ролю ўводнай характарыстыкі;
- распрацоўкай комплексу рознаўзроўневых пытанняў і заданняў, арыентаваных на засваенне адпаведнага праграмнага зместу пры азнаямленні і аналізе гістарычных дакументаў. Дадзеная тэндэнцыя пераважна ўвасоблена ў хрэстаматыйнай літаратуры для сярэдняй агульнаадукацыйнай школы [1–3]. Апарат у дадзеных выданнях складзены з улікам метадычных рэкамендацый, якія маюць тэхналагічны характар і звязаны са стварэннем дакументальна-метадычных комплексаў [4].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ